**Праграма мерапрыемства:**

**Пятніца, 31.05.2013**

$20^{00}$-$21^{30}$ Заезд удзельнікаў. Рэгістрацыя ўдзельнікаў у цэнтры спаборніцтваў.

**Субота, 01.06.2013**

$10^{00}$-$12^{00}$ Заезд удзельнікаў. Рэгістрацыя ўдзельнікаў у цэнтры спаборніцтваў.

$12^{30}$ Цырымонія адкрыцця спаборніцтваў.

$13^{00}$ Пачатак асабіста-камандных спаборніцтваў на доўгай дыстанцыі.

**Нядзеля, 02.06.2013**

$11^{00}$ Пачатак асабіста-камандных спаборніцтваў на сярэдняй дыстанцыі.

$15^{00}$ Узнагароджанне ўдзельнікаў. Цырымонія закрыцця спаборніцтваў. Ад'езд удзельнікаў.

**Тэхнічная інфармацыя**

**Каардынаты:** 53°33'15.9 27°1'54.9"

Фінішны гарадок аднолькавы абодва дні спаборніцтваў.






**Праезд у цэнтр спаборніцтваў:**

1. На электрацягніку ад ст. Інстытут Культуры да ст. Асіна, пасля сваім рухам па схеме прыкладна 2 км.
2. На машыне па трасе Мінск-Брэст, далей па дарозе Р68 у накірунку г.Узда, пасля ў п.Гарадзішчы направа. Рухацца каля 1,5 км.

**Расклад руху электрацягнікоў:** на старонцы http://www.rw.by.

| Дата | Накірунак | Час |
|---|---|---|
| 31-га траўня | ст.Мінск-пасажырскі ➜ ст.Асіна | **20:26**-21:46, **21:33**-22:46, **22:33**-23:52 |
| 1-га і 2-га чэрвеня | ст.Мінск-пасажырскі ➜ ст.Асіна | **07:54**-09:16, **09:41**-10:54 |
| 1-га і 2-га чэрвеня | ст.Інстытут Культуры ➜ ст.Асіна | **07:39**-08:48, **08:59**-10:07, **09:13**-10:24 |
| 1-га і 2-га чэрвеня | ст.Асіна ➜ ст.Мінск-пасажырскі | **14:46**-16:02, **16:03**-17:27, **16:40**-18:04, **18:05**-19:20, **19:39**-20:52, **20:16**-21:35 |
| 1-га чэрвеня | ст.Асіна ➜ ст.Інстытут Культуры | **21:08**-22:26 |
| 2-га чэрвеня | ст.Асіна ➜ ст.Інстытут Культуры | **13:39**-15:01, **19:17**-20:27, **21:08**-22:26 |

**Схема лагера:**



**Адзнака** на кантрольных пунктах: электроная, SI-чыпам. Чып выдаецца удзельнікам падчас рэгістрацыі. Мацаванне ЧЫПа на ровары не з’яўляецца абавязковым.

Усе КП размяшчаюцца на дарогах, легенды з тлумачэннем месца размяшчэння КП няма. Даўжыня дыстанцыі пазначаецца па **аптымальныму шляху**. Дазваляецца перасоўванне на ровары не толькі па дарогах і сцежках. Усе ўдзельнікі запаўняюць распіску аб асабістай адказнасці.

На скрыжаваннях дарогу саступае ўдзельнік, які рухаецца па больш вузкай дарозе. Абгон ажыццяўляецца з левага боку. Больш павольны ўдзельнік саступае дарогу больш хуткаму ўдзельніку. Прыярытэт мае ўдзельнік, які рухаецца ўгору.

**Мапа:** «Асіна». Мапа складзена з выкарыстаннем спецыяльных знакаў для арыентавання на роварах ISMTBOM-2010. Падрыхтоўка варыянта мапы для ровараў — красавік-травень 2013 год. На мапе выкарыстоўваецца спецыяльны знак “Тэрыторыя, па якой магчыма перасоўвацца ў любым напрамку”. Гэты знак не уваходзіць у ISMTBOM-2010. Акрамя гэтага, для паляпшэння чытальнысці мапы выкарыстоўваецца знак “паўгарызанталь”. Мапа не герметызавана. Мапа абмежаваная з паўночна-заходняга краю чыгункай Брэст-Мінск, з усходу трасай п.Энэргетыкаў-г.Узда.

**Мясцовасць:** Максімальны перапад на схіле 5 метраў. Лес хваёвых парод, саснова-яловы. Дарожная сетка шчыльная, некаторыя сцежкі захламленыя рэшткамі ад вывазу лесу, некаторыя праходзяць праз мокрыя балоты, некаторыя сцежкі былі ўзараныя. Дарогі рознай якасці – ад вузкіх лясных сцежак з мяккім грунтам да аўтамабільных неасфальтаваных дарог. Рух па краі раслінасці ўздоўж палеткаў магчымы, нават калі там няма сцежак. Перашкоды руху, якія пазначаны на мапе пурпурным колерам, - часцей за ўсё паваленыя дрэвы.

**Спецыяльныя знакі, якія выкарыстоўваюцца на мапе:**

| Знакі | Апісанне |
|---|---|
|  | Сцежкі, падчас пераадолення якіх узровень паглыблення ў ваду да 50 см. Часцей сустракаюцца ў 1-шы дзень. |
|  | Сцежкі, якія былі ўзараныя, таму па іх перасоўвацца магчыма толькі па краі. |
|  | Тэрыторыя, па якой магчыма перасоўвацца ў любым напрамку. |



**Небяспечныя месцы:** мокрыя балоты і жывёлы ў лесе (дзікі, гадзюкі, казулі), небяспечны пераход праз ручай, які пазначаны пурпурнай рысачкай як перашкода руху. Траса з усходу мапы п.Энэргетыкаў-г.Узда.

**Забароненыя месцы:** прыватныя ўчасткі, пазначаныя спецыяльным знакам 527 «Пасяленні»; дарога Р68 «п.Энэргетыкаў-г.Узда» на ўсходзе мапы, пазначаная спецыяльным знакам 707 «Забароненая дарога». Перасоўванне па яе маленькай частцы дазваляецца толькі ў першы дзень.

**Размінка:** па лясной дарозе ў бок п. Гарадзішча.

**Інфармацыя на 1-шы дзень.**

**Стартавы інтэрвал** 3 хвіліны. Мапы выдаюцца за 1 хвіліну да старту.

**Мапа:** фармат 26х28 см , маштаб 1:20000, сячэнне рэльефу 2м.

**Дыстанцыі.** **Кантрольны час:** 5 гадзін.

| Група | Дыстанцыя, км | Колькасць КП | Прыкладны час лідэра, хв |
|---|---|---|---|
| **М** | 39 | 22 | 110 |
| **Ж** | 32 | 20 | 90 |

Начальнік дыстанцыі: Кухто Пётр. Планіроўшчык: Юрок Антон.
Інспектар: Мямелаў Аляксей.

**Пункт падсілкоўвання** знаходзіцца ў фінішным гарадку, пазначаны на мапе.

**Участкі, якія пазначаны маркіроўкай** (будаўнічая бела-чырвоная стужка) на мясцовасці: ад 100-га КП да фінішу, ад старта да пункта «К» 20 метраў.

**Інфармацыя на 2-гі дзень.**

**Стартавы інтэрвал** 2 хвіліны. Мапы выдаюцца за 1 хвіліну да старту.

**Мапа:** фармат 22х32 см, маштаб 1:10000, сячэнне рэльефу 2м.

**Дыстанцыі.** **Кантрольны час:** 3 гадзіны.

| Група | Дыстанцыя, км | Колькасць КП | Прыкладны час лідэра, хв |
|---|---|---|---|
| **М** | 22 | 21 | 55 |
| **Ж** | 18,6 | 19 | 45 |

Начальнік дыстанцыі: Кухто Пётр. Планіроўшчык: Юрок Антон.
Інспектар: Макоўскі Уладзімір.

**Участкі, якія пазначаны маркіроўкай** (будаўнічая бела-чырвоная стужка) на мясцовасці: ад 100-га КП да фінішу, ад старта да пункта «К» 350 метраў.